ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

16 ЛІСТАПАДА
1995 года
чацвер

№16 (1733)

Камерцыйныя, недзяржаўныя ВНУ канкурэнцыі нам не складуць!..

З гэтага часу кожны год першы дзень лістапада выкладчыкі і студэнты былога аддзялення міжнародных зносін гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта будуць адзначаць як свята — дзень нараджэння. Бо 1 лістапада 1995 года ў БДУ адчыніўся новы факультэт — факультэт міжнародных зносін.

У сувязі з гэтай падзеяй мы сустрэліся з дэканам новага факультэта, доктарам гістарычных навук, прафесарам Аляксандрам Віктаравічам Шарапам.

— Мы стварылі факультэт, аб якім усе мы даўно марылі. Яшчэ тады, калі пры гістарычным факультэце адчынілася толькі аддзяленне міжнародных зносін, мы спадзяваліся, што яно хутка перарасце ў асобны факультэт. І вось спатрэбілася цэлых тры гады, каб наша мара збылася.

Нягледзячы на тое, што мы не маем пакуль свайго памяшкання, навіну аб стварэнні асобнага факультэта студэнты ўспрынялі "на ўра". Таму ў цяперашні час мы вядзем актыўную барацьбу за будынак. Дзе будзе гэты будынак — пакуль не вядома, але дакладна, што ён будзе. А пакуль рэктарат прадаставіў нам памяшканне ў корпусе па вуліцы Бабруйскай, дзе раней размяшчалася студэнцкая паліклініка. Часова там размясціліся нашы дэканат і тры кафедры. Таму, як бачыце, цяжкасці ў нас пакуль толькі арганізацыйныя, але мы іх пераадолеем.

— Напэўна, у сувязі са з'яўленнем асобнага факультэта, які вядзе падрыхтоўку дыпламатаў, адбыліся змены і ў навучальным працэсе?

— Так, зараз мы будзем рыхтаваць студэнтаў па трох спецыяльнасцях: міжнародныя адносіны, міжнароднае права і міжнародныя эканамічныя адносіны. А ў перспектыве плануем адкрыць і іншыя аддзяленні, напрыклад, "міжнародны турызм", паколькі гэтай спецыяльнасці зараз асаблівай увагі ніхто не надае. Апроч таго, мы плануем заняцца падрыхтоўкай студэнтаў для работы ў сферы міжнароднай інфарматыкі, а таксама ў галіне СМІ замежных краін.

У склад факультэта міжнародных зносін уваходзяць 6 кафедраў: міжнародных зносін — з гістарычнага факультэта, міжнароднага права — з юрыдычнага факультэта, міжнародных эканамічных зносін — з філасофска-эканамічнага, дзве кафедры замежных моў (кафедра англійскай мовы і кафедра раманскіх моў). І з новага навучальнага года пачне сваю працу кафедра дыпламатычнай і консульскай справы.

Факультэт міжнародных зносін склалі тыя студэнты, якія ўжо вучыліся на аддзяленні міжнародных зносін на гістарычным факультэце, а таксама студэнты аддзялення міжнароднага права юрыдычнага і міжнародных эканамічных зносін філасофска-эканамічнага факультэтаў. Зараз у нас навучаецца 320 студэнтаў.

— Скажыце, Аляксандр Віктаравіч, ці складана вучыцца на вашым факультэце?

— Ведаеце, канешне, нялёгка. Але абітурыенты да нас прыходзяць, на маю думку, самыя адукаваныя і самыя падрыхтаваныя. Таму паспяховасць у нас, відаць, самая высокая ва універсітэце. І тое, што за тры гады былі адлічаныя толькі 3 ці 4 студэнты, напэўна, пра нешта кажа.

Летась у нас адбыўся першы выпуск — 14 чалавек. І трэба сказаць, што мы вельмі задаволеныя сваімі выпускнікамі. Ніхто з іх не застаўся без працы: 10 чалавек працуюць зараз у сістэме МЗС, 2 — у Міністэрстве знешнеэканамічных сувязяў Рэспублікі Беларусь, адзін чалавек пайшоў працаваць у камерцыйную фірму, а аднаго выпускніка мы пакінулі вучыцца ў аспірантуры. Цяпер ён завяршае здачу экзаменаў, а ў перспектыве мы разлічваем зрабіць яго выкладчыкам нашай кафедры. Зараз, калі я цікаўлюся справамі нашых выпускнікоў, то з боку кіраўніцтва чую толькі цудоўныя водгукі і высокія ацэнкі. Нашы студэнты становяцца добрымі спецыялістамі, а дапамагаюць ім у гэтым вопытныя выкладчыкі. Толькі на кафедры міжнародных зносін у нас зараз працуюць 4 прафесары, 4 дацэнты. Гэта людзі высокакваліфікаваныя, з добрым веданнем сваёй справы, актыўныя і ініцыятыўныя. Таму нашыя дыпломнікі цудоўна абараніліся ў мінулым годзе, гэты выпуск таксама абяцае быць не горшым.

Хочацца толькі хутчэй сабраць усе тры аддзяленні ў адным будынку. Бо зараз юрысты-міжнароднікі займаюцца на юрыдычным факультэце, міжнародныя эканамісты — на філасофска-эканамічным, а наша аддзяленне знаходзіцца на гістарычным факультэце.

— Аляксандр Віктаравіч, скажыце, чаго могуць чакаць ад новага факультэта студэнты?

— Я спадзяюся, што ў факультэта складуцца новыя традыцыі, а тыя, што існуюць ужо зараз, будуць яшчэ больш развівацца і ўмацоўвацца. За тры гады існавання аддзялення міжнародных зносін мы наладзілі шырокія міжнародныя сувязі. У нас усталяваліся добрыя шчыльныя зносіны з Германіяй, у прыватнасці — са Свабодным універсітэтам у Берліне. У свой час я таксама вучыўся ў гэтай краіне, у 1976 годзе абараніў там кандыдацкую, а ў 1989 — доктарскую дысертацыю.

Абменныя паездкі становяцца добрай традыцыяй. Усе нашы студэнты, якія вывучаюць нямецкую мову, пабывалі ў Германіі, прычым, бясплатна: ужо тры разы мы вывозілі іх туды на навучальна-вытворчую практыку. Яны мелі магчымасць праслухаць па-нямецку курс лекцый прафесуры Свабоднага універсітэта Германіі па сусветнай палітыцы і па знешняй палітыцы Германіі. Сёлета мы паедзем да нашых нямецкіх сяброў ужо ў чацвёрты раз.

Нямецкія студэнты таксама не пакідаюць без увагі Беларусь. Яны праяўляюць агромную цікавасць да вывучэння часоў Другой сусветнай вайны. Таму, прыязджаючы да нас у госці, яны вельмі многа працуюць у архівах, вывучаюць дакументы і рукапісы. Мы арганізуем для іх таксама разнастайныя сустрэчы з ветэранамі, былымі падпольшчыкамі, ахвярамі канцлагероў і г.д. На падставе атрыманых новых звестак на радзіме яны пішуць і абараняюць дыпломы і дысертацыі і нават збіраюцца пісаць кнігу. Вы ведаеце, неверагодна дзіўна — гэтае новае пакаленне немцаў, якое выраслa ў пасляваенны час, ва ўмовах "халоднай вайны", жыве ў новай Германіі, зараз, старанна вывучаючы падзеі тых гадоў, адчувае велізарнае пачуццё віны перад нашым народам і нашай краінай за сваіх дзядоў і прадзедаў. Гэта абсалютна новае пакаленне! Мне часта даводзіцца чытаць для іх лекцыі аб падзеях Другой сусветнай вайны, і я бачу гэтыя поўныя ўвагі і спачування вочы.

Спадзяюся, што нашае супрацоўніцтва працягнецца на доўгія-доўгія гады, паколькі яно — карыснае для абодвух бакоў. Асаблівую ўвагу і дапамогу нам аказвае доктар Свабоднага універсітэта Германіі спадар Шлотц. Ён дапамог нам абсталяваць камп'ютэрнай тэхнікай клас. На гэтых камп'ютэрах працуюць зараз не толькі нашыя студэнты, але і студэнты гістарычнага факультэта. Апрача таго, мы атрымалі з Германіі мноства літаратуры па сусветнай палітыцы, палітыцы Германіі, краіназнаўству на англійскай і нямецкай мовах. З нямецкага пасольства ў Беларусі мы рэгулярна атрымліваем газеты і часопісы на нямецкай мове.

Апроч Свабоднага універсітэта Германіі мы падтрымліваем сяброўскія сувязі з універсітэтамі ЗША і коледжамі Англіі. Летась некалькі хлопцаў праходзілі ў Англіі моўную практыку. У цяперашні час мы спрабуем супрацоўнічаць з пасольствамі Японіі, Кітая, Італіі.

Вялікую ўвагу мы надаем моўнай падрыхтоўцы студэнтаў. Зараз увогуле на факультэце вывучаецца 9 моў. Сёлета ў якасці другой мовы студэнты пачалі вывучаць японскую, кітайскую, арабскую, італьянскую, чэшскую. А налета мы плануем увесці ў праграму гэтыя мовы ў якасці першых.

У нас склаліся добрыя адносіны з МГІМО і Кіеўскім інстытутам міжнародных зносін. Разам з МГІМО мы рыхтуем зараз праект стварэння асацыяцыі, куды ўвойдуць усе школы краін СНД, у якіх вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў-міжнароднікаў. Але ведаюць пра нас не толькі ў Маскве і Кіеве — у Венгрыі нас таксама прынялі ў Асацыяцыю школ краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы па даследаваннях у галіне міжнародных зносін.

Так што камерцыйныя, недзяржаўныя ВНУ канкурэнцыі нам не складуць!

— Што ж, вялікаму караблю — вялікае плаванне! Спадзяюся, што студэнты гэта ацэняць. Дзякуй Вам за размову.

Падрыхтавала Вольга Хадарэнка

РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: сацыялогіі, ядзернай фізікі;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ агульнай фізікі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: ядзернай фізікі, паліталогіі, рускай мовы, сацыялогіі, эканамічных навук, псіхалогіі, вышэйшай матэматыкі, рускай літаратуры, славістыкі, фізікі, гісторыі беларускай мовы, агульнай экалогіі, біяхіміі, сусветнай і айчыннай гісторыі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, матэматычнага мадэліравання і аналізу данных, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, радыёфізікі, інфарматыкі, гісторыі новага і найноўшага часу, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, дынамічнай геалогіі, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцей, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, філасофіі і метадалогіі навукі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: рускай мовы, эканамічных навук, радыёфізікі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, рыторыкі і методыкі выкладання славянскіх моў і літаратур, фізічнага выхавання і спорту;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: псіхалогіі, гісторыі новага і найноўшага часу, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, тэорыі літаратуры, замежнай літаратуры;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: заалогіі, дынамічнай геалогіі.

Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" ***16 лістапада*** *1995 года.*

Выставы

На базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта 5-7 сакавіка 1996 года адбудзецца Міжнародная выстава-семінар "Вышэйшая адукацыя ў Беларусі".

Выстава праводзіцца з мэтай азнаямлення выкладчыкаў, студэнтаў, спецыялістаў, работнікаў навукі, прамысловасці, бізнесу і ўсіх зацікаўленых асоб з навуковымі, педагагічнымі дасягненнямі вышэйшай школы, новымі ідэямі і накірункамі ў галіне адукацыі, а таксама мае на ўвазе абмен вопытам.

5-6 сакавіка ў рамках семінара "Міжнароднае супрацоўніцтва і развіццё вышэйшай адукацыі ў Беларусі" будуць працаваць наступныя секцыі:

1. Арганізацыя міжнароднага супрацоўніцтва ў вышэйшай школе.

2. Развіццё вузаўскай навукі і ўмацаванне яе сувязі з вытворчасцю.

3. Трансфармацыя грамадскіх навук на сучасным этапе.

4. Інфарматызацыя навучальнага працэсу і кіравання ў ВНУ.

У выставе прымуць удзел дзяржаўныя і недзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі, пасольствы, акрэдытаваныя ў Рэспубліцы Беларусь, прадстаўніцтвы міжнародных фондаў і праграм, выдавецтвы і іншыя арганізацыі, якія дзейнічаюць у сферы адукацыі. Запрашаем і Вас прыняць удзел у выставе-семінары.

Заяўкі на ўдзел і інфармацыя для каталога прымаюцца да 15 лютага 1996 года.

Дадатковыя паслугі (дадатковая выставачная плошча, абсталяванне, электрасілкаванне і г.д.) прадастаўляюцца на платнай аснове.

Урачыстае адкрыццё выставы адбудзецца 5 сакавіка 1996 года ў 10 гадзін у галоўным корпусе БДУ.

На Вучоным Савеце

Адзначаныя прэміямі

На пасяджэнні Вучонага Савета Белдзяржуніверсітэта прэміяй імя У.І.Пічэты быў узнагароджаны прафесар А.І.Зелянкоў за цыкл работ па філасофіі метадалогіі навукі, прэміяй імя А.Н.Сеўчанкі — доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар А.Б.Антаневіч і кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт А.В.Лебедзеў за цыкл работаў па С*— тэорыі функцыянальна-дыферэнцыяльных аператараў.

Прэміямі былі адзначаны і студэнты: за лепшую навуковую работу ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук студэнтка філфака Жылінская І.А. (за работу "Прастора, час і колер у аспекце бінарных карэляцый (на матэрыяле беларускай замоўнай традыцыі)") і ў галіне прыродазнаўчых навук студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі Хайдораў І.Э. (за работу "Распазнаванне злітнага беларускага маўлення на аснове адкрытых маркаўскіх мадэляў").

Усе лаўрэаты атрымалі грашовае ўзнагароджанне.

Як паведаміў начальнік Упраўлення па міжнародных сувязях Белдзяржуніверсітэта В.Г.Шадурскі, 25-27 красавіка 1996 года ў галоўным корпусе БДУ адбудзецца чарговая штогадовая Міжнародная выстава-семінар "Беларусь. Адукацыя-96".

Тут Вы зможаце не толькі прадставіць сваю арганізацыю, правесці прэзентацыю Вашых праграм і абсталявання, але і пазнаёміцца з дзейнасцю расійскіх і замежных фірм, міжнародных фондаў.

У праграме выставы будуць прадстаўленыя наступныя раздзелы: "Міжнародныя адукацыйныя, навукова-даследчыя, турыстычныя праграмы", "Тэхніка ў адукацыі і навуцы". Апошні раздзел уключае ў сябе кірмаш сродкаў навучання, дзе будуць дэманстравацца вучэбнае абсталяванне, новыя камп'ютэрныя тэхналогіі ў адукацыі, тэхнічныя сродкі навучання, сістэмы навучання замежным мовам, аргтэхніка і г.д.

Апрача таго будуць працаваць раздзелы "Выдавецтвы для адукацыі і навукі. Кніжны кірмаш", "Вышэйшая і сярэдняя школа Беларусі: праблемы і перспектывы". У рамках апошняга раздзела будуць прадстаўленыя афіцыйныя адукацыйныя праекты для Беларусі, наватарскія ідэі, школы, накірункі, самаадукацыя і развіццё творчых здольнасцей асобы.

Запрашаем навучэнцаў, студэнтаў, спецыялістаў у галіне адукацыі і наогул усіх ахвотных прыняць удзел у выставе.

Вы пазнаёміцеся з апошнімі дасягненнямі ў галіне адукацыі, тэхнічнага забеспячэння, з новымі накірункамі ў адукацыі, атрымаеце інфармацыю аб магчымасці навучання за мяжой і, магчыма, наладзіце творчыя кантакты з замежнымі партнёрамі.

Арганізатарамі выставы з'яўляюцца Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт, Міжнародная Асацыяцыя кансультантаў па адукацыі і кірмашах (Бон, Германія), Інавацыйны адукацыйны цэнтр (Масква, Расія).

Вячаслаў Міхайлавіч Шырокаў

23 кастрычніка 1995 года на 67 годзе жыцця пасля працяглай і цяжкай хваробы памёр выдатны навуковец у галіне гідралогіі акадэмік Міжнародных акадэмій, доктар геаграфічных навук, прафесар, загадчык кафедры агульнага землязнаўства геаграфічнага факультэта Вячаслаў Міхайлавіч Шырокаў.

В.М.Шырокаў нарадзіўся 14 лютага 1929 года ў горадзе Сімбірску, скончыў Казанскі універсітэт, з якім былі звязаны першыя гады яго навуковай і педагагічнай дзейнасці. Многія гады навуковай дзейнасці В.М.Шырокава прысвечаны вывучэнню гідралогіі і геамарфалогіі Волжскіх вадасховішчаў. Пасля абароны ў 1964 годзе кандыдацкай дысертацыі ён працуе ў Навасібірску, Сібірскім НДІ энергетыкі Мінэнерга СССР. У 1972 годзе ён паспяхова абараняе доктарскую дысертацыю па тэме "Фарміраванне берагоў і ложа буйных вадасховішчаў Сібіры". У той жа час ён вядзе педагагічную работу ва універсітэтах Сібіры, за што яму нададзена званне прафесара.

З 1974 года жыццё і дзейнасць В.М.Шырокава звязана з Беларуссю. Ён працуе ў ЦНІ ДВР (інстытут водных рэсурсаў), а з 1977 года — у Белдзяржуніверсітэце. У 1981 годзе Вячаслаў Міхайлавіч становіцца загадчыкам кафедры агульнага землязнаўства. На гэтай пасадзе прафесар В.М.Шырокаў праявіў сябе выдатным педагогам, арганізатарам навукі. Ён быў вядомы шырокаму колу навукоўцаў Масквы, Санкт-Пецярбурга, Польшчы, Балгарыі, Францыі і інш. Ва ўсіх кутках рэспублікі працуюць і працягваюць справу свайго настаўніка яго шматлікія вучні.

Светлая памяць аб Вячаславе Міхайлавічы Шырокаве назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто з ім працаваў.

Група таварышаў

Фірма венікаў не вяжа, фірма птушак прадае. Ва універсітэце

У мінулым месяцы на тэрыторыі універсітэта (Бабруйская, 7) быў адкрыты спецыялізаваны магазін Маладзечанскай птушкафабрыкі "Птушка".

На думку студэнтаў, магазін гандлюе галоўнымі для іх вучэбнымі дапаможнікамі — птушкай, яйкамі, каўбасой. Але, нягледзячы на невысокія цэны, стыпендыі хапае толькі на пячэнне "Да чая". Затое выкладчыкі і супрацоўнікі часта наведваюцца сюды.

На думку загадчыцы, Святланы Іванаўны Кавалёнак, пакупнікоў будзе значна больш, калі адкрыць уваход з боку вакзала ("хаця б на час работы магазіна, а ўвечары закрываць"). Але, калі меркаваць па чарзе, што выстройваецца больш чым за паўгадзіны да адкрыцця магазіна, дык пакупнікоў тут не бракуе.

Канферэнцыі

Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай

На філалагічным факультэце правядзенне міжнароднай навуковай канферэнцыі "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай" стала традыцыйным. На гэты раз яна адбылася 17-20 кастрычніка, стаўшы святам як для выкладчыкаў, так і для студэнтаў.

У праграму канферэнцыі было ўключана 130 дакладаў, запрошаныя навукоўцы не толькі з краін СНД (Расіі, Украіны), але і з Польшчы, Македоніі, Германіі ды іншых дзяржаў. Нягледзячы на складаныя эканамічныя ўмовы, змаглі прыехаць на канферэнцыю навукоўцы з Днепрапятроўска, Кіева, Растова, Вінніцы, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кірава, Пскова і іншых гарадоў. Навуковы патэнцыял канферэнцыі быў досыць высокім: 30% склалі акадэмікі, членкарэспандэнты, прафесары, 55% — кандыдаты навук, 15% — аспіранты, саіскальнікі і нават студэнты.

На пленарным пасяджэнні прыцягнулі ўвагу даклады гасцей — акадэміка з Македоніі Блажа Рысоўскага ("Македонская літаратура ў нацыянальных сувязях з сусветнай"), прафесара з Віцебска І.Л.Лапіна ("Супастаўляльнае літаратуразнаўства і кампаратывізм"), прафесара з Санкт-Пецярбурга І.М.Сухіх ("Будучыня ў А.П.Чэхава"). Плённа працавалі 7 секцый, на якіх было заслухана 85 дакладаў.

Высокім навуковым узроўнем вылучаліся даклады і нашых навукоўцаў — выкладчыкаў філалагічнага факультэта, якія былі адзначаныя на выніковым пленарным пасяджэнні: прафесара Лысенка С.А. "Віды гратэска ў сусветнай літаратуры і мастацтве", прафесара Шаблоўскай І.В. "Беларускі вобраз Чэхіі", дацэнта Сіньковай Л.Д. "Беларуская літаратура і тэорыя паскоранага літаратурнага развіцця", дацэнта Шалемавай А.А. "Паганскі і хрысціянскі элементы ў паэтыцы "Слова пра паход Ігаравы", дацэнта Ганчаровай-Грабоўскай С.Я. "Феномен трагікамедыі (А.Макаёнак і Р.Горын)", дацэнта Няфагінай Г.Л. "Паэтыка рамана М.Харытонава "Лініі лёсу, ці Куфэрак Мілашэвіча" (сістэма кодаў і культурныя рэмінісцэнцыі)", дацэнта Сініла Г.В. "Паэтыка Кнігі Хвалаў і еўрапейская лірычная традыцыя", кандыдата філалагічных навук Ткачовай П.П. "Творчасць Восіпа Арлоўскага: тэма, герой, час" і інш.

Як адзначалася на заключным пасяджэнні, кваліфікаваны навуковы падыход да даследаваных праблем прадэманстравалі не толькі прадстаўнікі старэйшага пакалення, але і аспіранты і саіскальнікі, якія ўдзельнічалі ў рабоце канферэнцыі (В.Халіпаў, Г.Жак, Н.Касцевіч, Т.Пташнікава, Н.Кулагіна і інш.).

Творчая атмасфера, абмен навуковымі ідэямі, дыскусіі, якія праходзілі на пасяджэннях канферэнцыі, сведчылі аб тым, што выбар тэмы канферэнцыі быў актуальным і навукова абгрунтаваным.

Госці з іншых дзяржаў адзначылі не толькі навуковы ўзровень канферэнцыі, шырыню тэматычнага дыяпазону дакладаў, але і асаблівую гасціннасць беларусаў.

Даклады ўдзельнікаў канферэнцыі будуць апублікаваныя ў зборніку, што дасць магчымасць азнаёміцца з імі ўсім ахвотным.

А.Лысава

Фестывалі

Свята кіно стане традыцыяй!

З 29 кастрычніка па 5 лістапада ў Мінску адбыўся кінафестываль "Лістапад", на якім былі прадстаўлены фільмы кінематаграфістаў краін СНД. Нягледзячы на цяжкасці, якія стаялі на шляху арганізатараў, свята адбылося, дзякуючы традыцыям дабрачыннасці, якія яшчэ захаваліся.

Мужнасць, самаадданасць і калектыўны гераізм прадзюсерскай групы фестываля дапамаглі гледачам сустрэцца з любімымі акцёрамі, рэжысёрамі і пераканацца ў тым, што ўсё ж такі самыя любімыя кінажанры: камедыя, фарс, меладрама — вернуты гледачам. А сустрэчы з акцёрамі і рэжысёрамі фільмаў стварылі атмасферу сапраўднага свята кіно!

Арганізатары "Лістапада-95" перакананыя, што правядзенне фестываля стане традыцыйным. А нам, гледачам, застаецца чакаць наступных сустрэч са Святам кіно.

Вольга Смалюгова

Рэжысёр Уладзімір Мяньшоў і яго жонка актрыса Вера Алентава.

Музей на юрыдычным факультэце. Загадчыца музея Лідзія Паўлаўна Максімава са сваімі памочнікамі.

ДАІ паведамляе

Вынікі аперацыі "Пешаход"

За 9 месяцаў 1995 года ў Мінску адбылася 537 дарожна-транспартных здарэнняў (ДТЗ): загінулі 98, параненыя 540 чалавек. 74% ДТЗ звязаныя з наездамі на пешаходаў. Прычына — недысцыплінаванасць, няўважлівасць і нецвярозы стан пешаходаў. Гэтым і была выкліканая неабходнасць правядзення з 16 па 31 кастрычніка аперацыі "Пешаход". Другой прычынай была патрэба звярнуць увагу на ўзаемна ветлівыя і далікатныя адносіны паміж пешаходамі і вадзіцелямі.

На працягу аперацыі "Пешаход" толькі па Маскоўскаму раёну выяўлена 1873 парушэнні ПДР пешаходамі, з іх 52 — у нецвярозым стане. Усё гэта — сведчанне нізкай дысцыпліны пешаходаў.

У кастрычніку па Мінску адбылося 104 ДТЗ: загінулі 12, параненыя 106 чалавек.

Па Маскоўскаму раёну за 10 месяцаў адбылося 86 ДТЗ: загінулі 10, параненыя 93 чалавекі.

Мы звяртаемся да ўсіх удзельнікаў дарожнага руху: не парушайце Правілы дарожнага руху! Будзьце дысцыплінаванымі. Жыццё даецца чалавеку адзін раз, беражыце яго.

Начальнік АДАІ Маскоўскага РАУС маёр міліцыі А.М.Слесарэнка

Кароткa

Аддзелам па справах моладзі БДУ падрыхтаваны зборнік дакументаў і матэрыялаў па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце ў Белдзяржуніверсітэце.

У бліжэйшых нумарах нашай газеты мы плануем расказаць аб гэтым больш падрабязна.

Афіцыйна

Палажэнне аб парадку работы падраздзяленняў Белдзяржуніверсітэта з замежнымі навучэнцамі

Упраўленне па міжнародных сувязях:

— распрацоўвае метадычныя рэкамендацыі па кантрактнай сістэме і іншых пытаннях, якія тычацца навучання замежных грамадзян,

— арганізоўвае інфармацыйна-рэкламную дзейнасць па прыцягненню замежных грамадзян на вучобу ў БДУ на кантрактнай аснове,

— вядзе перагаворы і заключае па ўзгодненню з факультэтамі дагаворы з прадстаўнікамі замежных фірмаў і арганізацый аб прыёме на вучобу замежных грамадзян,

— заключае па ўзгодненню з факультэтамі індывідуальныя кантракты з замежнымі грамадзянамі,

— афармляе запрашэнне і аказвае візавую падтрымку кандыдатам на вучобу,

— праводзіць рэгістрацыю нацыянальных пашпартаў замежных грамадзян і афармляе ім візавыя дакументы, па ўзгадненню з аддзелам аспірантуры і факультэтамі рыхтуе адпаведныя матэрыялы для прапіскі па месцы жыхарства,

— праводзіць азнаямленне замежных навучэнцаў з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь па пытаннях прававога становішча замежных грамадзян, садзейнічае ім у афармленні медыцынскай страхоўкі,

— распрацоўвае і каардыніруе мерапрыемствы па арганізацыі выпуску замежных навучэнцаў,

— заказвае білеты на авіяі чыгуначны транспарт для выпускнікоў,

— вядзе арганізацыйную работу з замежнымі навучэнцамі, якія прыбылі для ўключанага навучання па лініі міжвузаўскага супрацоўніцтва і прамых кантактах,

— праводзіць усю арганізацыйную работу, звязаную з функцыянаваннем навучальна-метадычных курсаў для замежных грамадзян пры Упраўленні па міжнародных сувязях (афармленне загадаў, якія тычацца гэтай катэгорыі замежных навучэнцаў, выдача студэнцкіх білетаў, пасведчанняў па заканчэнню курсаў, засяленне ў інтэрнат, правядзенне медыцынскага кантролю, медыцынскага страхавання, кантроль за аплатай кантракта і г.д.),

— каардыніруе работу зямляцтваў замежных навучэнцаў,

— прадастаўляе ў рэктарат, планава-фінансавыя органы неабходныя статыстычныя звесткі, якія датычацца замежных навучэнцаў,

— ажыццяўляе ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі, грамадскімі арганізацыямі і прыватнымі асобамі па пытаннях, якія тычацца знаходжання і навучання ў БДУ замежных грамадзян.

Дэканаты факультэтаў:

— вызначаюць у выніку субяседвання ступень падрыхтаванасці замежных навучэнцаў для навучання на гэтым факультэце,

— сумесна з Упраўленнем па міжнародных сувязях заключаюць кантракты з замежнымі грамадзянамі на навучанне на кампенсацыйнай аснове (аспірантура, стажыроўка, поўны курс навучання),

— ажыццяўляюць кантроль за своечасовай аплатай кантрактаў,

— афармляюць службовую запіску аб залічэнні (адлічэнні) замежных студэнтаў і падаюць яе ў аддзел кадраў,

— выдаюць накіраванне на засяленне ў інтэрнат замежным студэнтам,

— ажыццяўляюць кантроль за выкананнем правіл пражывання і перамяшчэння замежных грамадзян у Рэспубліцы Беларусь,

— паведамляюць ва Упраўленне па міжнародных сувязях інфармацыю аб усіх перасяленнях замежных навучэнцаў з аднаго інтэрната ў другі, пераездзе на прыватную кватэру, інфармуюць Упраўленне аб усіх парушэннях пашпартнага рэжыму замежнымі навучэнцамі,

— забяспечваюць яўку адлічаных замежных грамадзян ва Упраўленне па міжнародных сувязях для перапынення рэгістрацыі ў нацыянальным пашпарце і афармлення выязной візы,

— вядуць усю навучальную і пазааўдыторную працу з замежнымі навучэнцамі на факультэце,

— фарміруюць асабістыя справы замежных студэнтаў і здаюць іх у аддзел кадраў. У асабістую справу ў абавязковым парадку ўключаюцца наступныя дакументы:

а) кантракт на навучанне (накіраванне на вучобу міністэрства альбо ВНУ-партнёра),

б) загад аб залічэнні на вучобу,

в) копія дакумента аб адукацыі з перакладам на рускую (беларускую) мову,

г) дакумент аб заканчэнні падрыхтоўчага факультэта ці курсаў УМС,

д) медыцынскі сертыфікат, які пацвярджае адсутнасць інфекцыйных захворванняў і іншых медыцынскіх супрацьпаказанняў для навучання ў Белдзяржуніверсітэце,

е) асабістая анкета замежнага навучэнца з фотаздымкам.

Пасля заканчэння альбо адлічэння ў асабістую справу ўключаюцца загад аб адлічэнні, а таксама копіі выдадзеных дакументаў аб атрыманай адукацыі,

— па запытах замежных навучэнцаў выдаюць неабходныя даведкі, дазволы на запрашэнне сваякоў і афармленне неабходных віз. Заява замежных навучэнцаў з дазволам дэкана факультэта павінна паступіць ва Упраўленне па міжнародных сувязях у адпаведныя тэрміны (віза за межы СНД — 20 дзён, у межах СНД — 10 дзён, запрашэнне сваякоў — 3 месяцы),

— сумесна з Упраўленнем па міжнародных сувязях арганізуюць штогадовыя медыцынскія агляды замежных навучэнцаў. Замежныя навучэнцы, якія не прайшлі ў зацверджаныя тэрміны медыцынскі агляд без уважлівай прычыны, адлічваюцца з Белдзяржуніверсітэта,

— сумесна з вучэбна-метадычным упраўленнем афармляюць і выдаюць замежным навучэнцам неабходныя дакументы па заканчэнню вучобы,

— прадастаўляюць Упраўленню па міжнародных сувязях неабходную інфармацыю, якая датычыцца навучання і знаходжання замежных навучэнцаў.

Аддзел аспірантуры:

— па прадстаўленню факультэтаў афармляе загад аб залічэнні на вучобу і прызначэнні стыпендыі аспірантам,

— праводзіць усю неабходную вучэбную і арганізацыйна-метадычную працу з замежнымі аспірантамі,

— фарміруе і захоўвае асабістую справу аспіранта,

— выдае накіраванне на засяленне ў інтэрнат замежным аспірантам,

— арганізуе праходжанне замежнымі аспірантамі штогадовых медыцынскіх аглядаў,

— афармляе запрашэнні замежным аспірантам-завочнікам на тэрмін не большы за два месяцы ў год, калі іншае не агаворана ў кантракце,

— ажыццяўляе адлічэнне аспірантаў і выдачу ім адпаведных дакументаў,

— прадастаўляе ва Упраўленне па міжнародных сувязях неабходную інфармацыю, якая датычыцца навучання замежных аспірантаў.

Дырэкцыя студэнцкага гарадка:

— праводзіць на падставе накіраванняў, выдадзеных дэканатамі факультэтаў, аддзелам аспірантуры, Упраўленнем па міжнародных сувязях Белдзяржуніверсітэта, засяленне замежных навучэнцаў у інтэрнат,

— забяспечвае высяленне замежных навучэнцаў з інтэрната па заканчэнню навучання,

— устанаўлівае нормы аплаты за пражыванне ў інтэрнаце замежных навучэнцаў розных катэгорый і кантралюе своечасовае ўнясенне аплаты,

— заключае кантракты з замежнымі навучэнцамі на атрыманне звышнарматыўнай жылой плошчы ў інтэрнаце і пражыванне ў інтэрнаце членаў сем'яў замежных навучэнцаў, кантралюе аплату па заключаных кантрактах,

— арганізуе прапіску замежных навучэнцаў і членаў іх сем'яў у інтэрнаце,

— кантралюе захоўванне пашпартнага рэжыму замежнымі навучэнцамі. Супрацоўнік студэнцкага гарадка, які адказвае за прапіску замежных навучэнцаў, пастаянна (не радзей аднаго раза ў месяц) інфармуе Упраўленне па міжнародных сувязях аб стане пашпартнага рэжыму і яго парушэннях,

— аператыўна інфармуе Упраўленне па міжнародных сувязях, дэканаў факультэтаў аб самавольным перасяленні замежных навучэнцаў у іншыя інтэрнаты, на прыватныя кватэры, аб іншых парушэннях,

— вядзе ўлік замежных навучэнцаў, якія пражываюць у інтэрнатах Белдзяржуніверсітэта.

Вучэбна-метадычнае ўпраўленне:

— па прадстаўленню матэрыялаў з факультэтаў афармляе дыпломы і акадэмічныя даведкі міжнароднага ўзору замежным выпускнікам і грамадзянам Беларусі, якія выязджаюць за мяжу на сталае месца жыхарства.

Агульна-прававы аддзел:

а) агульная канцылярыя ажыццяўляе прыём і адпраўку міжнароднай карэспандэнцыі,

б) архіў па запытах замежных выпускнікоў, а таксама былых грамадзян Беларусі, якія выехалі на сталае месца жыхарства за мяжу, выдае і высылае на іх адрас архіўныя даведкі. Падставай для выдачы гэтых матэрыялаў з'яўляецца распараджэнне рэктара (прарэктара).

Аддзел кадраў:

— па прадстаўленню факультэтаў афармляе загады аб залічэнні і аб адлічэнні замежных студэнтаў. Копіі загадаў у абавязковым парадку накіроўваюцца ва Упраўленне па міжнародных сувязях універсітэта,

— сумесна з факультэтам фарміруе і захоўвае асабістыя справы замежных студэнтаў і па заканчэнні вучобы здае справы ў архіў.

М А Й С Т Р О Ў Н Я

Ягор Конеў — выпускнік факультэта журналістыкі БДУ 1994 года. Сёлета ў "Бібліятэчцы часопіса "Маладосць" выйшла першая кніга ягоных твораў "Вартавыя", прадмову да якой напісаў Віктар Казько (імя, якое шмат скажа аматару беларускага прыгожага пісьменства). Віншуем Ягора і прадстаўляем адно з яго апавяданняў.

Пра сябра

Маім лепшым сябрам у школе быў Мішка Караблёў. У нас было шмат агульнага — абое трымаліся асобна ад аднакласнікаў, абое дрэнна вучыліся і абое былі нецікавымі для дзяўчат.

Адной з прыгажунь у нашым класе была Вольга Крэўская: За сем гадоў вучобы я не памятаю ніводнага разу, каб Мішка размаўляў з ёю. Але аднойчы на ўроку гісторыі, калі Вольга адказвала настаўніку ля дошкі, я заўважыў, якімі вачыма Мішка пазірае на яе, і са здзіўленнем падумаў: няўжо кахае?

Напрыканцы другой чвэрці Вольга цяжка захварэла. Моцны вецер на вуліцах гнуў у дугу прахожых, завеі круцілі карагоды над зямлёю, а ў Мішкавых вачах з'явіўся сум.

На другі дзень пасля таго, як Вольжыны сяброўкі распавялі ўсім у класе пра тое, як цяжка яна хварэе, ён папрасіў мяне:

— Хадзем да яе!

— Ды ты што!— заўпарціўся я.— Як на нас паглядзяць яе бацькі? Мы ж з ёй ніколі не сябравалі...

— Якая мне справа да бацькоў! Я цябе раней ніколі ні пра што не прасіў! Я і адзін пайшоў бы, ды саромеюся чагосьці...

Ці мог я адмовіць яму?

Мы выправіліся да яе пасля заняткаў.

Вольгу не здзівіў наш прыход. Калі мы прайшлі з калідора ў пакой, я адразу заўважыў, што яе скура на твары пажаўцела, а валасы крыху пасівелі. Яна нерухома ляжала на ложку, бо не магла ўстаць, і з вялікай цяжкасцю павярнула галаву на нас. Мішка адразу ўладкаваўся ў кутку і прамаўчаў увесь час візіту, толькі неадрыўна пазіраў на дзяўчыну. Таму гутарыць з Вольгай прыйшлося мне.

Я пераказаў ёй апошнія школьныя навіны і пацікавіўся, як яна сябе адчувае.

— Самі можаце бачыць, якое ў мяне самаадчуванне,— за час хваробы Вольжын голас непазнавальна змяніўся.— Доктар сказаў маці, што я ўжо не ўстану. Так усё жыццё і праваду на гэтым ложку. Доктар не ведае, як можна мяне лячыць. А маці кажа, што гэтая хвароба — пакаранне за грахі яе бацькоў. А ці ж вінавата я ў грахах яе бацькоў?

Па яе шчоках цяклі слёзы. Я не мог глядзець на Вольгу, нібыта і мая віна была ў яе хваробе, таму пераводзіў позірк то на вокны, то на стол. Мішка ж быццам акамянеў і не адводзіў позірку ад Вольгі. Заставацца далей у гэтай кватэры было амаль немагчыма. Мы развіталіся з Вольгай, паабяцаўшы зайсці яшчэ, і пайшлі да дзвярэй. Перад тым, як сыйсці, Мішка сказаў Вользе толькі адно:

— Ты ўсё ж спадзявайся на лепшае.

У адказ дзяўчына толькі горка пасміхнулася.

Пасля гэтага візіту да хворай у нас быў такі настрой, калі ні з кім не хочацца размаўляць і нікога не хочацца бачыць. Мы моўчкі разышліся па дамах.

Пасля зімовых канікул захварэў і Мішка. Ён таксама быў вымушаны цэлымі днямі ляжаць і не варушыцца. Я прыходзіў да яго штодзень.

У красавіку ў школу вярнулася Вольга. Хвароба нечакана пакінула яе. Яна засталася ранейшай прыгажуняй. Яе прыход надаў мне аптымізму. Калі яна вылечылася ад гэтай жудаснай хваробы, дык і з Мішкам можа атрымацца тое ж самае! Завітаўшы да яго пасля заняткаў, я так яму ўсё і сказаў.

— Не атрымаецца,— быў Мішкаў адказ.— Вольга таму выздаравела, што я ўзяў яе хваробу. Памятаеш той наш візіт да яе?

— Але...

— Я потым увесь астатні дзень думаў, чым можна Вользе дапамагчы. Думаў-думаў і не заўважыў, як заснуў. Мне прыснілася чырвоная рака. Раптам з той ракі выходзіць брыдкая пачвара, падобная да воблака, і звяртаецца да мяне. "Ты,— кажа,— можаш выратаваць сваю каханую — возьмеш яе хворасць. А калі не згодзен, дык зараз жа прачнешся і не ўспомніш аб маёй прапанове". Я і кажу: "Згодны."—"І ніякіх умоў не ставіш?" — "Няхай Вольга будзе той жа прыгажуняй, якой была раней".—"Дамовіліся",— адказала пачвара і зайшла ў чырвоную раку.

— Жудасны сон!— вырвалася ў мяне.

— Калі б толькі сон! Прачнуўшыся ўранку, я адчуў, што не магу варухнуцца. І тады я зразумеў, што наша змова ўступіла ў сілу...

— Ды нашто ты гэта зрабіў?!— закрычаў я. — Яна ж ніколі не даведаецца пра твой учынак! Я скажу — мне ж ніхто не паверыць. Ды ці вартая Вольга таго, каб з-за яе?..

— Вартая,— адказаў Мішка.

— Можа, ты проста надзяліў яе якасцямі, якіх у яе няма і ніколі не будзе? А на самой справе ніякая яна не добрая і зусім не прыгажуня,— у гэты момант я так ненавідзеў Вольгу, што жадаў ёй смерці.— Яна ж знойдзе сабе потым здаровага хлопца ды пойдзе з ім да шлюбу...

Я рэзка змоўк, падумаўшы, што толькі дарэмна катую адзінага сябра, вымаўляючы такія жорсткія рэчы.

— Ты асуджаеш мяне, таму што нават не маеш уяўлення пра сапраўднае каханне,-- сумна глядзеў Мішка ў стол. — Лёс жорстка абышоўся са мной, але інакш я зрабіць не мог. І я не страчваю спадзяванняў на лепшае. І ты заўсёды спадзявайся на лепшае.

... Праз два гады майго бацьку, маёра супрацьпаветраных сілаў, перавялі на новае месца службы. Разам з ім пераехала жыць у другі горад і ўся наша сям'я. Болей мне не давялося сустрэцца з Мішкам. Я напісаў яму некалькі лістоў, але адказу не дачакаўся.

Я часта бачыў яго па начах, у сне. Бачыў нерухома ляжачага, з сумам і з недзіцячай мудрасцю ў вачах. Іншы раз бачыў яго разам з Вольгай. Мішка намагаўся некуды ісці, а яна стаяла побач і гладзіла яго шэрыя валасы.

Што ёсць сны ў нашым жыцці? Я не ведаю. Але гэта ўсё, што я хацеў распавесці.

Адзін са стваральнікаў "Бум-Бам-Літа" — крайне авангарднай плыні ў сучаснай беларускай літаратуры — Серж Жук-Мінскевіч адначасова з'яўляецца выпускніком філалагічнага факультэта БДУ. Рэдакцыя газеты "Беларускі універсітэт" спадзяецца, што гумарэска, прадастаўленая Сержам для нашага выдання, даставіць задавальненне і нашым чытачам.

Рука Афрадыты

31 ліпеня 1995 г. аператары цэнтра інфармацыі дзяржаўнай бяспекі Беларусі раптам атрымалі трывожнае паведамленне спецыяльнага агента Кларка:

— Мною на вуліцы Аранскай горада Мінска назіраецца народнае хваляванне. Хаця гэта не маніфестацыя нацыяналістаў і не мітынг камуністаў; трэба праверыць, мусіць, тут вінавата "рука ЦРУ", але хутчэй за ўсё мною назіраецца стыхійны, так бы мовіць, усплёск эмоцыяў.

Падзеі пачаліся з таго, што на праезджай частцы белая "жыгулішка" і чорны "мерсэдэс" сутыкнуліся лоб у лоб, як у народзе кажуць, пацалаваліся, а іх кіроўцы, малады хлопец і прыгожая дзяўчына, вылецелі праз ветравыя шыбы сваіх аўтамабіляў, пры гэтым аскепкі шкла садралі з іх усё адзенне; аголеныя хлопец і дзяўчына ў паветры дзіўным чынам аднымі толькі вуснамі сутыкнуліся, што вонкі вельмі нагадала сапраўдны пацалунак. Невядомая сіла ўзняла іх высока ў неба, а потым пачала іх апускаць на капот "мерсэдэса". Падчас свайго неверагоднага палёту дзяўчына і хлопец яўна вельмі захапіліся адно адным, пачалі абдымацца, бессаромна прыціскацца... Карацей, на капот яны апусціліся цалкам занятыя, як бы так выказацца, эратычным недазволам!

І за гэтым назіралі пасажыры тралейбуса № 30, які ішоў у бок вакзала, і тралейбуса № 3, які накіроўваўся на ДС "Несцерава". У такіх адказных варунках кіроўцы тралейбусаў № 30 і № 3 з паркавымі нумарамі 2322 і 2534, маладая кабета і статны мужчына, дапусцілі недаравальную нядбайнасць: завярнуўшы галовы да маладых бессаромнікаў на "мерсэдэсе", яны не справіліся з кіраваннем і сутыкнуліся сваімі тралейбусамі. І мала таго, самі высунуліся праз пабітае шкло і пачалі заўзята цалавацца, чым падалі дрэнны прыклад усім пасажырам. Тыя павыскоквалі са сваіх тралейбусаў праз аварыйныя выхады і, адшукаўшы сабе пару з іншага тралейбуса, таксама пачалі цалавацца.

Праз лічаныя хвіліны ў дарожна-транспартную оргію былі ўцягнуты ўсе ўдзельнікі гарадскога руху: і таксісты, і прыватнікі, і кіроўцы "Ікарусаў", і пасажыры "Ікарусаў", і медперсанал "хуткай дапамогі", і пенсіянер, якога тая "хуткая дапамога" спешна везла ў рэанімацыю; і нават сяржант ДАІ, які быў на хаду зняты з матацыкла, атакаваны дзвюма невядомымі грамадзянкамі і незаконна пазбаўлены жэзла і каскі.

Становішча значна пагоршылася пасля таго, як на бліжэйшым пераездзе быў спынены цягнік "Мінск — Сімферопаль", у якім адпраўляліся ў будатрад студэнты філалагічнага факультэта БДУ, у выніку чаго прапорцыя паміж жанчынамі і мужчынамі рэзка павялічылася на карысць першых, што ім, жанчынам, не надта спадабалася. Пачалося сапраўднае паляванне на мужчын. Іх адусюль вылоўлівалі, распраналі і зацалоўвалі.

Але калі да падзеяў далучыліся работніцы недалёкай адсюль кандытарскай фабрыкі "Камунарка", стыхійны ўсплёск эмоцыяў пачаў набываць больш пратэстовы, страйкавы характар. Мужчыны зрабіліся такім страшэнным дэфіцытам, што як іх ні вылоўлівалі і ні раздзялялі на колькасць жаночых асобаў, усё роўна на ўсіх жадаючых іх не хапала. Пачуліся лозунгі: "Дайце мужчын!", "Па добраму мужыку кожнай жанчыне!", "Спадарыні, возьмем каханне ў свае рукі!" А потым выявіўся страйкам і незаконна аб'явіў сённяшні дзень 31 ліпеня ДНЁМ СВАБОДНАГА КАХАННЯ!..

У дадзены момант перадавыя калоны пратэстуючых жанчын з транспарантам "31 ліпеня — Дзень свабоднага кахання" накіроўваюцца ў бок Чэрвенскага рынку. Тэрмінова прымайце меры...

Раптам агент Кларк дзіка завішчаў:

— Няхай жыве свята свабоднага кахання! Ура!

Прабачце, таварышы, гэта мяне пад ялінкай, адкуль я вяду назіранне, заўважыла невялікая купка жанчын...

Не памінайце ліхам... Прывітанне сваякам...

— Ня-ааа! Жжы-ыыы! Каахаааання!!

Далей пачуліся неразборлівыя выгукі... І каля хвіліны ў аператарскіх навушніках нешта стагнала, мычала, трашчала.

— Гэй, тфу, тфу, тфу,— нейкая кабета падзьмула ў мікрафон,— чуеце нас?! Мы, вольныя жанчыны Беларусі, патрабуем дэкларацыі дзень 31 ліпеня Днём свабоднага кахання. А зараз спешна высылайце нам атрад АМОНа! Мы іх з нецярпеннем чакаем!..

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты - рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная змена" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

Газета падпісана ў друк у 12.00.

16 лістапада
Зак 663.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 206827.

В.а. рэдактара Т.М. Казак